# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

УДК 172:17.022.1

*Т. Я. Сінькевіч*

## Роля маральнага здароўя ў развіцці асобы

*Маральнае здароўе разглядаецца як складанае мнагамернае паняцце, якое адлюстроўвае розныя аспекты чалавечага быцця. Тэарэтычна асэнсоўваюцца падыходы даследчыкаў да вызначэння сутнасці паняцця «маральнае здароўе». Адзначаецца, што ў сучасных умовах для развіцця асобы важна фарміраваць маральны імунітэт да духоўнай пагрозы, берагчы і ўмацоўваць маральнае здароўе, асабліва ў падрастаючага пакалення. Падкрэсліваецца, што цэнтральнае месца ў фарміраванні маральнага здароўя займаюць каштоўнасна-матывацыйныя ўстаноўкі. Ад таго, наколькі паспяхова ўдаецца сфарміраваць і замацаваць у свядомасці прынцыпы і навыкі маральных паводзін у сацыяльным асяроддзі ў юным узросце, залежыць жыццядзейнасць чалавека.*

*Аўтар прыходзіць да высновы, што маральнае здароўе апасродкавана духоўнасцю і маральнасцю асобы, засваеннем агульначалавечых каштоўнасцей, развіццём маральных якасцей і выпрацоўкай маральных перакананняў, норм паводзін, а таксама ўзроўнем маральнага развіцця.*

*Мэта артыкула* – паказаць, што фарміраванне маральнага здароўя адбываецца з улікам аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, якія абумоўліваюць складанасць дадзенага працэсу, яго дынамічнасць, рухомасць і зменлівасць.

Здароўе асобы, з'яўляючыся безумоўнай каштоўнасцю, адносіцца да ліку найважнейшых паказчыкаў, якія характарызуюць эканамічны, сацыяльны і духоўны дабрабыт грамадства. Здароўе дапамагае кожнаму з нас усвядоміць свае фізічныя і духоўныя магчымасці, дазваляе ўспрымаць свет ва ўсёй яго разнастайнасці, адкрывае перад чалавекам шырокія перспектывы ў працы, адпачынку, грамадскіх справах.

Аднак у апошні час, паводле вынікаў навуковых даследаванняў, тэндэнцыя пагаршэння стану здароўя насельніцтва прымае ўстойлівы характар. Катастрафічна маладзеюць такія з'явы, як наркаманія, таксікаманія, алкагалізм. Назіранні паказваюць, што ў грамадстве не знікаюць таксама і такія духоўна-маральныя адмоўныя з'явы, як чэрствасць, эматыўная глухата, абыякавасць да старасці, інваліднасці, хвароб, матэрыяльных цяжкасцей, сацыяльнай адзіноты і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сённяшні час патрабуе пошуку новых каштоўнасна-светапоглядных арыенціраў у фарміраванні ў маладых людзей маральнага імунітэту да духоўнай пагрозы, зберажэнні і ўмацаванні маральнага здароўя. Усё больш актуалізуецца праблема забеспячэння бяспекі як на глабальным узроўні, так і на ўзроўні пэўнага соцыуму, асобнага індывіда. Беларускі навуковец С. В. Кірпіч адзначае: «Пытанне аб духоўна-маральнай складаючай здароўя чалавека (яго абароненасць у духоўна-маральным сэнсе) з'яўляецца настолькі важным, што яго атаясамліваюць з фактарам бяспекі нацыі, дзяржавы» [7].

Аналіз навуковай літаратуры паказвае, што пытанні асэнсавання феномена здароўя і яго захавання заўсёды знаходзіліся ў цэнтры ўвагі вядомых навукоўцаў і мысліцеляў (Сакрат, Арыстоцель, Платон, Піфагор, Канфуцый, Я. А. Каменскі, Ф. Бэкан і інш.), а паняцце «здароўе» разглядалася даследчыкамі не толькі як саматычная, фізічная, псіхічная, але і маральная характарыстыка здароўя чалавека.

Старажытнагрэчаскія філосафы разглядалі духоўнасць як выражэнне чалавечага духу, станаўленне асобы. Платон, вучань Сакрата і настаўнік Арыстоцеля, надаваў духоўным фактарам вырашальнае значэнне і звязваў стан здароўя чалавека не з дзеяннем лекаў, а з правільным духоўным жыццём і працай чалавека, накіраванай на самога сябе. Дэмакрыт Абдзерскі лічыў, што для духоўнага здароўя чалавека важна знаходжанне ў стане спакою і раўнавагі, калі не хвалююць ніякія запалы, страхі і іншыя перажыванні. Адзначаючы сутнасць духоўна-маральнай складаючай здароўя, Дэмакрыт прытрымліваўся думкі, што чалавеку больш належыць звяртаць увагу на душу: «Больше надо стыдиться самого себя, и для души должен быть установлен закон: "Не совершай ничего неподобающего"» [1].

Піфагор Самоскі, стваральнік рэлігійна-філасофскай школы піфагарэйцаў, вызначаў здароўе як гармонію ўсіх элементаў чалавечага арганізма, спалучэнне разнастайных і часам супярэчлівых якасцей, якія звязаны з праявай і духоўнага, і цялеснага жыцця. Ён распрацаваў ледзь не першую ў свеце сістэму дабрадзейнага жыцця. Асноўныя прынцыпы аздараўлення Піфагор бачыў у тым, што чалавек павінен любым спосабам пазбягаць і адсякаць: ад цела – хваробу, ад душы – невуцтва, ад дома – рознагалоссе, ад горада – смуту, ад страўніка і ўсяго ў цэлым – празмернасць [11, с. 338].

Такім чынам, важнасць маральнай складаючай здароўя была аксіёмай ужо для філосафаў антычнай старажытнасці, якія прыйшлі да высновы, што маральнае здароўе чалавека, яго перакананасць у правільнасці сваіх паводзін, у справядлівасці ўчынкаў, падмацаваная павагай суграмадзян, з'яўляецца неабходнай умовай не толькі шчаслівага, але і здаровага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне псіхолага-педагагічнай, сацыялагічнай і філасофскай літаратуры паказала, што значны ўклад у навуковую распрацоўку праблемы маральнага здароўя, выхавання і фарміравання маральных якасцей асобы зрабілі такія вучоныя, як С. Ф. Анісімаў, В. І. Бакштаноўскі, Н. І. Болдыраў, Г. А. Голубева, А. Г. Драбніцкі, Л. В. Канавалава, П. Ф. Лесгафт, Н. Д. Нікандраў, І. Ф. Свадкоўскі, А. І. Цітарэнка, Л. М. Фрыдман, В. Д. Шадрыкаў, Н. Е. Шчуркова і інш.

Адзначым даследаваныя вучонымі сучасныя падыходы да фарміравання здаровага ладу жыцця школьнікаў і студэнтаў у дысертацыйных працах В. М. Беленава, І. А. Герасімава, Н. У. Самусевай, культуры здароўя ўвогуле (Г. І. Пракапенка, К. С. Трысцень).

У даследаваннях навукоўцы і педагогі справядліва адзначаюць, што пры ўсёй важнасці фізічнага здароўя вядучая роля ў выхаванні асобы ўсё ж адводзіцца духоўна-маральнаму кампаненту, толькі ў гэтым выпадку магчыма паўнавартаснае здароўе. Фізічна і псіхічна здаровы чалавек можа быць маральна нездаровы, калі ён не прытрымліваецца норм маралі.

Для ўсебаковага раскрыцця паняцця «маральнае здароўе» звернемся да навуковых прац сучасных расійскіх вучоных В. П. Пятленкі і Д. Н. Давідзенкі. На іх погляд, «маральнае здароўе» – гэта комплекс характарыстык матывацыйнай і патрабавальна-інфармацыйнай асновы жыццядзейнасці чалавека. Такое ж вызначэнне мы знаходзім у беларускіх даследчыкаў Р. І. Купчынава і Л. К. Сіўцова [4; 12].

А. Ф. Валачаева ў дысертацыйным даследаванні «Уплыў вузаўскай сацыялізацыі на маральнае здароўе студэнцкай моладзі» разглядае маральнае здароўе як састаўную частку сацыяльнага здароўя асобы. Яно ўяўляе сабой такі стан свядомасці і форм паводзін сацыяльных суб’ектаў, у якіх узровень суадносін норм і дэвіяцыі вызначаецца існуючай сістэмай грамадскіх адносін, іх спецыфікай. А. Ф. Валачаева прыходзіць да высновы, што маральнае здароўе як асаблівы від самаадчування індывіда «вызначаецца веданнем норм і правіл паводзін, маральнымі звычкамі, эматыўна-станоўчым стаўленнем да маральных арыенціраў, устойлівым унутраным пераканаццем у неабходнасці іх выканання» [2].

Расійскі навуковец У. Я. Жураўлёў прааналізаваў педагагічныя сродкі захавання маральнага здароўя дзяцей у сістэме ўстаноў дадатковай адукацыі. Ён разглядае працэс развіцця маральнага здароўя як стан жыццядзейнасці чалавека, вызначаны яго патрабавальнай, інфармацыйнай і матывацыйнай сферамі, які выяўляецца ў яго ўменні знаходзіцца ў гармоніі з сабой (сваім унутраным светам) і са знешнім светам (прыродай, соцыумам) [6].

Падобнага азначэння прытрымліваецца А. Я. Кучарава, якая лічыць, што маральнае здароўе адлюстроўвае стан каштоўнасна-матывацыйнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сферы чалавека, якая характарызуецца здольнасцю захоўваць устойлівасць (адаптыўнасць) ва ўмовах маральнага выбару [9].

Па вызначэнні большасці айчынных і замежных навукоўцаў, «маральнае здароўе» – гэта комплекс характарыстык матывацыйнай і патрабавальна-інфармацыйнай сферы ў жыццядзейнасці чалавека, аснову якой складае сістэма каштоўнасцей, установак і матываў паводзін індывіда (Р. І. Купчынаў, Л. К. Сіўцоў, В. П. Пятленка, Д. Н. Давідзенка і інш.). Разам з тым, як адзначаюць даследчыкі, маральнае здароўе з'яўляецца галоўнай перадумовай, якая дазваляе чалавеку справіцца з сацыяльнымі, псіхалагічнымі і фізічнымі цяжкасцямі.

Адметнымі прыкметамі маральнага здароўя чалавека, сцвярджаюць Л. К. Сіўцоў, В. Н. Давідзенка, В. П. Пятленка, з'яўляюцца, перш за ўсё, высокая духоўнасць, актыўнае непрыманне нораваў і звычак, якія супярэчаць агульначалавечым каштоўнасцям.

Такім чынам, маральным здароўем апасродкавана духоўнасць і маральнасць чалавека, бо яно звязана з агульначалавечымі ісцінамі дабра, любові і прыгажосці [4; 12]. У якасці паказчыкаў маральнага здароўя разглядаюцца наяўнасць мэты і сэнсу жыцця, надзеі чалавека, яго жаданне жыць, яго перакананні. Яно характарызуецца здольнасцю чалавека да творчасці, пачынаючы ад ідэй да іх рэалізацыі, увасаблення ў матэрыяльнай форме.

Расійскі даследчык Л. А. Громава, разважаючы пра маральнае здароўе, уводзіць паняцце «здаровая маральнасць індывіда» і вылучае галоўнае ў ім – развітую здольнасць да самарэгуляцыі і самакантролю за паводзінамі як праяву асабістай годнасці, волі, сацыяльнай сталасці. Найважнейшымі перадумовамі фарміравання такой здольнасці выступаюць перакананасць асобы, яе светапогляд, пачуццё сумлення. Маральнае здароўе, – разважае аўтар, – гэта «стан задаволенасці асобы, усведамленне адпаведнасці сваіх маральных каштоўнасцей сацыяльным нормам, прынцыпам і ідэалам» [3].

Крытэрыямі дыягностыкі маральнага здароўя, па У. Я. Жураўлёву, з'яўляюцца ўзроўневыя паказчыкі, якія складаюць каштоўнасна-матывацыйную сферу асобы: іерархія жыццёвых патрабаванняў, маральная самаацэнка, маральная матывацыя, адносіны да жыццёвых каштоўнасцей, этыка паводзін.

У. Я. Жураўлёў і А. Я. Кучарава характарызуюць маральнае здароўе наступнымі крытэрыямі:

1. Скіраванасць матываў чалавека (адсутнасць амаральных думак і ўчынкаў, пастаяннае імкненне да духоўнага самаўдасканалення);

2. Высокая ступень супраціўлення ў адносінах да маральна неспрыяльных уздзеянняў (аптымальная рэакцыя на неспрыяльнае ўздзеянне соцыуму і хуткае самавызначэнне ў сітуацыях маральнага выбару);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Узровень ведаў аб маральным баку рэчаіснасці;

4. Дастатковая сацыяльная адаптацыя (талерантнасць у адносінах да соцыуму, адэкватныя паводзіны ў сям'і і грамадстве);

5. Маральна-каштоўнаснае перажыванне аб'ектаў навакольнага свету.

Захаванне маральнага здароўя падразумявае, з пункту гледжання дадзеных аўтараў, не падтрыманне яго на пэўным статычным узроўні, а бесперапыннае развіццё каштоўнасна-матывацыйнай асновы, умацаванне духоўных сіл асобы, назапашванне ёю маральных ведаў і маральнага вопыту [5; 6; 9].

Асаблівую цікавасць маюць выдзеленыя А. Ф. Валачаевай 5 крытэрыяў маральнага здароўя:

1) *кагнітыўны (ментальны)* – індывід мае высокамаральныя погляды, перакананні, прызнае ўсеагульныя цывілізацыйныя каштоўнасці;

2) *маральны* – чалавек асуджае амаралізм у свядомасці і дэвіянтныя паводзіны людзей навокал;

3) *дзейнасны* – выконвае маральныя нормы, правілы і патрабаванні як агульначалавечага, так і прафесійна-статуснага характару;

4) *сацыяльны* – звыклымі формамі паводзін асобы з'яўляюцца тыя паводзіны, якія адказваюць пазітыўным патрабаванням дадзенага грамадства;

5) *структурна-сістэмны* – дзеянні індывіда не парушаюць нармальнага функцыянавання арганізма як складанаарганізаванай сацыяльнай сістэмы [2].

Аналіз азначэнняў маральнага здароўя, якія апісаны вышэй, дазваляе нам зрабіць выснову, што цэнтральнае месца ў фарміраванні маральнага здароўя займаюць каштоўнасна-матывацыйныя ўстаноўкі чалавека. Ад таго, наколькі паспяхова ўдаецца сфарміраваць і замацаваць у свядомасці прынцыпы і навыкі маральных паводзін у сацыяльным асяроддзі ў юным узросце, залежыць у наступным уся жыццядзейнасць чалавека.

На аснове аналізу даследаванняў дадзеных аўтараў можна адзначыць, што маральнае здароўе апасродкавана духоўнасцю і маральнасцю асобы, засваеннем агульначалавечых каштоўнасцей, узроўнем развіцця і выпрацоўкай маральных якасцей і перакананняў, норм паводзін.

Агляд псіхолага-педагагічнай літаратуры паказаў, што вытокі фарміравання маральнага здароўя ляжаць яшчэ ў дзяцінстве, калі ў дзіцяці пачынае фарміравацца маральная шкала адносін, з дапамогай якой ён вучыцца вымяраць свае і чужыя ўчынкі з агульначалавечых пазіцый дабра і зла і не толькі ацаніць, але і падпарадкаваць свае паводзіны маральным нормам. Самае складанае і важнае ў працэсе фарміравання маральнага здароўя, каб галоўнымі рухавікамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарматыўных паводзін дзяцей сталі не матывы, заснаваныя на страху пакарання ці атрымання станоўчага падмацавання, а матывы бескарыслівага добразычлівага стаўлення да іншага чалавека, эмпатыя, каштоўнасць сумеснай дзейнасці.

Прычынамі змены духоўна-маральнай сферы, якая з'яўляецца ядром маральнага здароўя чалавека, з'яўляюцца ўмовы яго развіцця на працягу ўсяго жыцця. І тут неабходна ўлічваць, што фарміраванне маральнага здароўя – працэс шматфактарны, які будуецца з улікам аб'ектыўных (сацыякультурнае асяроддзе) і суб'ектыўных фактараў (іх ствараюць родныя і блізкія, педагогі і сябры), якія абумоўліваюць складанасць дадзенага працэсу, яго дынамічнасць, рухомасць і зменлівасць. Калі ўмовы складваюцца спрыяльныя, то маральнае здароўе чалавека ў працэсе яго развіцця не толькі будзе фарміравацца, захоўвацца, але і ўмацоўвацца. Калі мы гаворым пра маральнае здароўе, то неабходна згадаць і фактары, якія здольны падарваць яго. Гэта такія адмоўныя сацыяльныя з'явы, як абыякавасць, жорсткасць, зайздрасць, нянавісць, злосць.

Пры характарыстыцы маральнага здароўя асобы, Л. А. Громава лічыць неабходным адзначыць і такія фактары, як ўстойлівасць і цэласнасць лініі паводзін асобы, якія адпавядаюць грамадскім нормам і ідэалам.

Такім чынам, маральна здаровы чалавек – гэта той, хто жадае іншым людзям дабра, здольны на спачуванне, сяброўства, каханне, добрыя ўчынкі, хто ўмее зразумець іншага чалавека, аказаць дапамогу, абараніць у цяжкай сітуацыі.

Здольнасць пабудаваць сваю лінію паводзін у адпаведнасці з гуманістычнай маральнасцю патрабуе ведання такіх грамадскіх з'яў, як дабро і зло. Паводзіны, заснаваныя на глыбока засвоеных маральных патрабаваннях, – ёсць праява і паказчык устойлівасці маральнага здароўя. Самі па сабе сацыяльныя і маральныя каштоўнасці, якія абвяшчаюцца афіцыйнай маральнасцю, не могуць служыць гарантыяй маральнага здароўя яго членаў. Пацвярджэнне гэтаму мы знаходзім у Л. А. Громавай, якая падкрэслівае, што маральнае здароўе залежыць ад «ступені адпаведнасці індывідуальных маральных норм пануючым у грамадстве патрабаванням» [3].

Маральнае здароўе патрабуе загартоўкі і найбольш эфектыўна гэты працэс ажыццяўляецца пры фарміраванні актыўнай жыццёвай пазіцыі асобы. Большасць даследчыкаў адзначаюць, што фарміраваць маральнае здароўе неабходна праз сістэму маральных якасцей і каштоўнасцей, на якія варта арыентаваць асобу – любоў да людзей, дабро, свет, свабода, сумленне, ісціна, сям'я, праца і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па сцвярджэнні П. Ф. Лесгафта, кожнае дзіця, якое нарадзілася без паталогіі, можа вырасці ў высокамаральную асобу, калі яму будуць створаны нармальныя ўмовы для выхавання і самавыхавання [10]. Крыніцай фарміравання маральных якасцей выступае сацыяльны вопыт, які заключаны ў грамадскіх нормах, правілах і прынцыпах паводзін чалавека ў грамадстве [13]. Маральныя якасці індывіда фарміруюцца на аснове грамадска значных каштоўнасцей, якія становяцца жыццёвымі арыенцірамі для чалавека. Патрэба ў захаванні і развіцці маральнага здароўя рэалізуецца ў дзейнасці чалавека ва ўзаемадзеянні з іншымі людзьмі.

На думку беларускага навукоўца У. Т. Кабуша, веды, уменні, навыкі не могуць выступаць вынікам выхаванасці. Можна ведаць нормы паводзін, але не выконваць іх. І можна іх выконваць, каб схаваць свае сапраўдныя погляды і намеры. Сапраўдная выхаванасць чалавека, падкрэслівае У. Т. Кабуш, вызначаецца сфарміраванымі маральнымі, душэўнымі і духоўнымі каштоўнасцямі [7].

Такім чынам, фарміраванне маральнага здароўя атаясамліваецца з выхаваннем маральных якасцей асобы, далучэннем да агульначалавечых каштоўнасцей.

Характарызуючы духоўна-маральныя якасці асобы, беларускі даследчык С. В. Кірпіч адзначыў, што ў склад параметраў духоўна-маральнай складаючай здароўя павінны быць уключаны:

– гатоўнасць і здольнасць да духоўна-маральнага развіцця, самаўдасканалення, разумення сэнсу жыцця, адказных паводзін;

– гатоўнасць і здольнасць да рэалізацыі творчага патэнцыялу ў духоўна-маральнай сферы, прафесійнай дзейнасці, сацыяльных камунікацыях;

– умацаванне духоўна-маральнага імунітэту, захаванне этычных норм, заснаваных на класічных дабрадзейных справах чалавека, на ўнутраных установках асобы паступаць згодна з сумленнем, выхаваннем на традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцях;

– здольнасць фармуляваць і гатоўнасць выконваць маральныя абавязкі і маральныя нормы, ажыццяўляць маральны самакантроль думак, пачуццяў і ўчынкаў;

– гатоўнасць і здольнасць выказваць і адстойваць сваю асобасную пазіцыю ў калектыве і грамадстве, крытычна ацэньваць уласныя намеры, думкі і ўчынкі;

– здольнасць да самастойных учынкаў і дзеянняў, якія выконваюцца на аснове выбару, заснаванага на духоўна-маральных установках асобы, на адказнасці за вынікі прынятых рашэнняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– здольнасць і гатоўнасць да пераадолення цяжкасцей, мэтанакіраванасць і настойлівасць у дасягненні выніку, а таксама працавітасць, беражлівасць і жыццёвы аптымізм;

– гатоўнасць і здольнасць прымаць сябе, іншых людзей, успрымаць чалавека як вышэйшую каштоўнасць, у той жа час праяўляць нецярпімасць да дзеянняў і ўплываў, якія нясуць пагрозу здароўю (фізічнаму і маральнаму), духоўна-маральнай бяспецы асобы;

– гатоўнасць і здольнасць да рэфлексіі (да аналізу і прыняцця рашэнняў) у асабістым і грамадскім жыцці на аснове духоўна-маральных каштоўнасцей;

– здольнасць і гатоўнасць рэалізаваць свой патэнцыял у сям'і, у прафесійным калектыве, у грамадстве [8].

Такім чынам, асноўным зместам маральных якасцей асобы з'яўляюцца суадносіны грамадскага і ўласнага ва ўсведамленні, паводзінах і дзейнасці.

Фарміраванне маральнага здароўя, як адзначае А. Я. Кучарава, магчыма толькі пры ўмове, калі ў выхаваўчы працэс (як навучальнай установы, так і ў сям'і) будуць уключаны наступныя этапы: 1) развіццё эматыўнай сферы (з мэтай выхавання маральных пачуццяў); 2) уключэнне этычнай асветы (якая садзейнічае фарміраванню маральнай свядомасці); 3) арганізацыя практычнай дзейнасці (выхоўвае ўстойлівасць навыкаў маральных паводзін); 4) ажыццяўленне дыягностыкі вынікаў (іх улік вядзецца ў працэсе выхавання) [9].

Фарміраванне маральнага здароўя асобы – гэта працэс сістэматычнага і мэтанакіраванага ўзаемадзеяння як арганізатараў, так і выхаванцаў, якія накіраваны на развіццё высокага ўзроўню маральна-актыўнай жыццядзейнасці, адаптаванасці да пастаянна зменлівага навакольнага і сацыяльнага асяроддзя з мэтай фарміравання маральных ідэалаў і каштоўнасцей, пачуццяў і свядомасці, выпрацоўкі ўменняў і звычак этычных паводзін, а таксама здольнасцей да маральнага самавызначэння, самарэалізацыі і самаўдасканалення ў адносінах да сябе і ва ўзаемадзеянні з іншымі людзьмі.

На аснове абагульнення даных тэарэтычнага аналізу па праблеме маральнага здароўя і яго ролі ў развіцці асобы можна зрабіць наступныя вывады. Маральнае здароўе асобы неабходна разглядаць у дынаміцы сталення чалавека, яно патрабуе стварэння спецыяльна арганізаваных умоў. Асноўнымі этапамі працэсу фарміравання маральнага здароўя асобы з'яўляюцца: фарміраванне духоўных каштоўнасцей, установак і матываў этычных паводзін, развіццё маральных свядомасці і актыўнасці, пачуццяў і эмоцый (эматыўнай устойлівасці), а таксама ўзбагачэнне вопыту дабрачыннай дзейнасці, якая выяўляе каштоўнаснае стаўленне асобы да сябе і іншых людзей.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Існіна гаворыць, што толькі здаровы чалавек з добрым самаадчуваннем, аптымізмам, псіхалагічнай і маральнай устойлівасцю, высокай разумовай і фізічнай працаздольнасцю здольны актыўна жыць, паспяхова пераадольваць прафесійныя і бытавыя цяжкасці.

Тэма маральнага здароўя і яго ролі ў развіцці асобы з'яўляецца актуальнай і важнай у сацыяльна-культурнай і педагагічнай практыцы, таму што сучаснаму грамадству патрэбны не толькі фізічна развітыя асобы, але адказныя, рашучыя, смелыя, шчырыя, верныя сяброўству, здольныя стварыць моцную сям'ю і аддана служыць сваёй Радзіме.


*1. Виц, Б. Б.* Демокрит [Электронный ресурс] / Б. Б. Виц. – М. : Мысль, 1979. – 212 с. – Режим доступа: https://nemaloknig.com/read-258465/?page=26. – Дата доступа: 27.11.2019.

*2. Волочаева, О. Ф.* Влияние вузовской социализации на нравственное здоровье студенческой молодежи : дис. … канд. пед. наук : 22.00.04 / О. Ф. Волочаева. – Ставрополь, 2005. – 167 с.

*3. Громова, Л. А.* Нравственное здоровье личности / Л. А. Громова. – Л. : Знание, 1985. – 17 с.

*4. Давиденко, Д. Н.* Здоровье и образ жизни студентов : учеб. пособие / Д. Н. Давиденко, Ю. Н. Щедрин, В. А. Щеголев. – СПб. : СПбГУИТМО, 2005. – 124 с.

*5.* Духовность, нравственность, традиции : сб. материалов по итогам Респ. науч.-практ. конф. «Реализация Программы сотрудничества между Министерством образования Республики Беларусь и Белорусской православной церковью посредством инновационной деятельности в учреждениях образования», Жировичи, 30–31 мая 2013 г. / Минская духовная академия ; сост.: свящ. Святослав Рогальский, Н. Н. Захожая. – Минск : Ковчег, 2014. – 197 с.

*6. Журавлев, В. Е.* Педагогические средства сохранения нравственного здоровья детей в системе учреждений дополнительного образования : дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / В. Е. Журавлев. – Шуя, 2002. – 152 с.

*7. Кабуш, В. Т.* Ценности – основа гуманистической воспитательной системы / В. Т. Кабуш // Праблемы выхавання. – 2005. – № 6. – С. 19–24.

*8. Кирпич, С. В.* Духовно-нравственные составляющие здоровья человека / С. В. Кирпич // Здоровый образ жизни: медико-социальные аспекты : материалы респ. науч.-практ. конф., Минск, 18 нояб. 2011 г. / Белорусское общество «Знание» ; редкол.: П. И. Беспальчук (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2012. – С. 26–33.

*9. Кучерова, О. Е.* Проблема духовно-нравственного здоровья в современном воспитании / О. Е. Кучерова // Среднее профессиональное образование. – № 10. – 2006. – С. 18–21.

*10. Лесгафт, П. Ф.* Психология нравственного и физического воспитания : избр. психол. тр. / П. Ф. Лесгафт ; под ред. М. П. Ивановой ; Акад. пед. и соц. наук, Моск. психол.-соц. ин-т. – М. : Ин-т практ. психологии, 1998. – 410 с.

*11.* Пифагор. Золотой канон. Фигуры эзотерики. – М. : Эксмо, 2003. – 408 с.

*12. Сивцов, Л. К.* Здоровье старшеклассников – наша общая проблема / Л. К. Сивцов // Здаровы лад жыцця. – 2004. – № 5.

*13. Чекина, Е. В.* Теория нравственного воспитания: история развития и современное состояние : моногр. / Е. В. Чекина. – Гродно : ГрГУ, 2008. – 119 с.


*T. Sinkevich*

**The role of moral health in an individual's development**

*Moral health is considered as a complex multidimensional concept that reflects various aspects of human existence. Researchers 'approaches to determining the essence of the concept*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*of "moral health" are theoretically interpreted. It is noted that in modern conditions it is important for an individual's development to form a moral immunity to a spiritual threat, protect and strengthen moral health, especially in the younger generation. It is emphasized that the central place in the formation of moral health is occupied by value and motivational attitudes. A person's vital activity depends on how we succeed to form and consolidate the principles and skills of moral behaviour in social environment at a young age.*

*The author comes to the conclusion that moral health is mediated by the spirituality and morality of the individual, the assimilation of the universal values, the development of moral qualities and the development of moral beliefs, norms of behavior, as well as the level of moral development.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 10.02.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ